Госпад стварыў іх такімі рознымі!



# Органы пачуццяў насякомых



**Вусікі- антэны**

вочы



**Ротавы апарат**



# Пачуцці чалавека

Слых



Смак



Нюх



Дотык



Зрок



# Пачуцці насякомага

Слых- чуллівыя валаскі

Смак- на нагах



Нюх- антэны





Зрок- вочы



Дотык- чуллівыя валаскі

# Зрок насякомых

Зрок неабходны насякомым  пры пошуку ежы, каб пазбягаць драпежнікаў, вывучаць наваколле, пазнаваць суродзічаў. У іх складаныя вочы, якімі насякомыя бачаць свет, нібы мазайку. Але бываюць і дадатковыя простыя вочкі




ЧАЛАВЕК








НАСЯКОМАЕ

Вока мухі пад мікраскопам





Нага жука пад мікраскопам

Галава матылька



# Слых насякомых

У насякомых няма такіх вушэй, як у нас, але органы слыху ёсць і размешчаны яны ў дзіўных месцах: на вусах у камароў, мурашак, матылькоў; на нагах у цвыркуноў і конікаў, жыватом чуе саранча. Некаторыя насякомыя чуюць тонкімі валасінкамі, якія ў вялікай колькасці размешчаны на розных частках цела, як пчолы і чмялі. Пры чым некаторыя насякомыя чуюць такія гукі, якія не чуе чалавек, так званыя ультрагукі, гэта дапамагае ім хавацца ад драпежнікаў. Так пакаёвую муху складана злавіць не таму, што ў яе добры зрок, а добры слых- яна чуе узмах рукі.







# Смак і нюх у насякомых



Смак большасць насякомых адчуваюць лапкамі, некаторыя і ротам.
Доўгі нос у камара не нос зусім, а рот. А пахі ён адчувае пры дапамозе вусікаў. У пошуках ежы насякомыя арыентуюцца на пахі. Праўда прывабліваюць іх не заўсёды смачныя для нас пахі. Мухі любяць пахі гнілога мяса і бруду, а таксама яны любяць кветкі, што нясмачна для нас пахнуць. Акрамя таго насякомыя і самі вылучаюць пахі, пры дапамозе якіх размаўляюць з суродзячамі.



Як харчуюцца насякомыя?

















**Усе насякомыя харчуюцца па-рознаму. Адныя ядуць расліны, іншыя – невялікіх жывых істот, трэція – нектар. Некаторыя харчуюцца крывёй.**







Сківіцы коніка, якімі ён адкусвае траву дзейнічаюць , як кусачыкі. Самка камара хабатком, нібы шпрыцом, пратыкае скуру і высмоктвае кроў.












Ротавыя органы мухі ўбіраюць вадкасць, як губка збірае ваду.
Матылёк смокча нектар, нібы праз трубачку.













Пчала харчуецца нектарам



Багамол такі ж драпежнік, як і страказа



Страказа есць іншых маленькіх насякомых: мух, напрыклад



Мурашы могуць есці і іншых жывых істот, і піць нектар







**Як дыхаюць насякомыя?**

На іх брушку і грудзях размешчаны спецыяльныя адтуліны – дыхальцы. Затым паветра па усім целе разносяць тоненькія трубачкі – трахеі. З дапамогай клапанаў на дыхальцах насякомае кантралюе колькасць паветра, якое паступае ў арганізм, а таксама фільтруе яго, каб не забрудзіць трахеі



# МАЛАЙЦЫ!

